***А.М. Макарэвіч*** (Магілёў)

# ЛІТАРАТУРНА-ЭСТЭТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ ПІСЬМЕННІКА: ТЭАРЭТЫЧНЫ І МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТЫ
## (на прыкладзе выкладання творчасці Цёткі ў кантэксце гісторыі беларускай літаратуры 1900 – 1930 гг. у ВНУ)

У працэсе выкладання гісторыі беларускай літаратуры па сістэме перспектыўных ліній мэтазгодна звяртацца да характарыстыкі літаратурна-эстэтычных поглядаў пісьменнікаў з мэтай паэтапнага складвання ў свядомасці студэнтаў цэласнай карціны эстэтычных пошукаў у творчасці асобных аўтараў (манаграфічны ўзровень), а затым – цэласнага ўяўлення (аглядавы ўзровень) аб эстэтычных напрамках развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства адпаведнага перыяду.

У сувязі з гэтым у працэсе выкладання гісторыі беларускай літаратуры 1900 – 1930 гг. мэтазгодна звяртацца да наступных этапаў. **А)** ***тэарэтычная падрыхтоўка*** ў форме ўступнай характарыстыкі эстэтычных прынцыпаў і форм асваення і адлюстравання рэчаіснасці (пытанні: літаратурна-эстэтычныя[1] погляды пісьменніка: формы адлюстравання; іх роля ў працэсе асэнсавання аўтарскай канцэпцыі прыгожага ў свеце, жыцці і мастацтве; спецыфіка эстэтычнай інтэрпрэтацыі літаратурных тэкстаў увогуле і першай трэці XX ст. у прыватнасці). **Б)** ***назапашванне ўменняў*** эстэтычнага аналізу канкрэтнага літаратурнага тэксту, твораў аднаго і розных пісьменнікаў (магчымыя формы на лекцыйных занятках: эстэтычная інтэрпрэтацыя асобных

[1] У дадзеным выпадку зыходнымі паняццямі з'яўляюцца наступныя. **Літаратурныя погляды пісьменніка** – гэта яго погляды на праблемы, пытанні, звязаныя з развіццём літаратуры: а) у мінулым, б) у сучаснасці, в) у будучым. **Эстэтычныя погляды пісьменніка** – погляды **на сутнасць** прыгожага ў прыродзе, рэчаіснасці, мастацтве, **на спосабы і формы** адлюстравання прыгожага мастаком у яго творы, **на** працэс ***уздзеяння*** твора на свядомасць рэцыпіента, ***спасціжэння*** гэтага прыгожага рэцыпіентам з мэтай пераўладкавання рэчаіснасці ў больш прыгожыя формы.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

тэкстаў // супастаўляльны аналіз тэкстаў аднаго і таго ж пісьменніка // параўнальна-супастаўляльны аналіз твораў, раней аналізаваных, з новымі ў кантэксце вывучэння творчасці іншага пісьменніка; метадычны аспект: інтэрпрэтацыя адбываецца *ў кантэксце выкананых студэнтамі апераджальных заданняў* да лекцый (папярэдняе знаёмства з тэкстамі // вылучэнне вобразаў з эстэтычным зместам // папярэдняя спроба іх інтэрпрэтацыі паводле прынцыпу "аб'ект, з'ява рэчаіснасці – мастацкі вобраз – яго сэнс"), *у кантэксце інтэрактыўных форм працы* (ролевыя ацэнкі – пісьменнік, крытык, чытач // інтэрпрэтацыйная праца у групах і інш.). **В)** ***фарміраванне ўменняў*** падагульняючай характарыстыкі эстэтычных пошукаў і сцверджанняў у літаратуры адпаведнага перыяду *з мэтай* літаратурна-эстэтычных супастаўленняў, падрыхтоўкі да цэласнай характарыстыкі асаблівасцей развіцця нацыянальнай літаратуры (магчымыя формы працы на практычных занятках: індывідуальная характарыстыка літаратурна-эстэтычных поглядаў на матэрыяле сукупнасці твораў // інтэрпрэтацыя эстэтычнага зместу асобных твораў, падрыхтаваная на практычных занятках групамі студэнтаў // інтэрактыўнае абмеркаванне вынікаў такой інтэрпрэтацыі // інтэрпрэтацыя эстэтычнага аспекту твора ў выглядзе эсэ і інш.).

*Назапашванне ўменняў эстэтычнага аналізу асобных вершаў Цёткі* – у кантэксце форм працы, акрэсленых у прапанаваным вышэй пункце "Б".

**1**. *Тэксты для аналізу*: "Музыкант беларускі", "Вам, суседзі", "Скрыпка", "Мае думкі", "Артыст грайка", "На магіле", "Грайка", "Арлы-брацці, дайце скрыдлы..." і інш. **2**. *Апераджальнае заданне* да лекцыі: **а**) вылучыць у вершах "Скрыпка", "На магіле", "Арлы-брацці, дайце скрыдлы..." вобразы з эстэтычным зместам, **б**) суаднесці сутнасць з'яў, аб'ектаў рэчаіснасці, якія сталі падмуркам для адпаведных вобразаў з сэнсам гэтых вобразаў у кантэксце твора. **3**. *Асаблівасці інтэрпрэтацыі*: **а**) метадычны аспект – **а-1**) наяўнасць у кожнага студэнта тэкстаў, схем альбо праекцыя іх праз мульцімедыйную сістэму; **а-2**) характарыстыка вобразаў у паслядоўнасці тэкстаў, вызначаных у апераджальным заданні; **а-3**) абмеркаванне вынікаў выканання апераджальнага задання з выкарыстаннем інтэрактыўных форм працы; **а-4**) інтэрпрэтацыя выкладчыкам эстэтычнага зместу твораў з апераджальнага задання з выкарыстаннем схем пабуджальных для лірычнага героя сітуацый і схем суаднясення з'яў і аб'ектаў рэчаіснасці з літаратурнымі вобразамі; **а-5**) у якасці падагульненняў – выхад на сістэму метадычных і тэарэтычных перспектыўных ліній; **б**) тэарэтычны аспект – **б-1**) характарыстыка пабуджальных для лірычных герояў сітуацый[2] : апошняе выйсце – // перадумовы грання на скрыпцы // змадэляваная ігра на скрыпцы //

---

[2] Тут і далей прыводзяцца прыклады толькі з верша "Скрыпка"; на лекцыі аналізуюцца ўсе тры вершы.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

выніковасць змадэляванай ігры // рэальная гатоўнасць лірычнага героя да здзяйснення раней агучаных памкненняў; **б-2)** суаднясенне з'яў і аб'ектаў рэчаіснасці з літаратурнымі вобразамі: кіпець // *на сэрцы накіпела*; крайняя жыццёвая сітуацыя // *астаецца скрыпку ўзяці*; неба // *думка рве да неба*; зламанае крыло птушкі // *покі скрыдал не зламалі*; хлеб паўсядзённы // *покі трэба душы хлеба*; пярун // *у песні можна даць пяруны*; сэрца // *песняй сэрца рваць на часці*; духоўнасць // *дух народу я абняла б*; жар у кузні // *у жары сэрца растапіла б*; алтар // *алтар новы улівала б*; малітва // *малітвай смык завыў бы*; праклящце // *то закляў бы на пяруны* і інш.; **б-3)** вывады.

У дадзеных тэзісах прапанаваны толькі адзін з магчымых шляхоў фарміравання ў студэнтаў уменняў інтэрпрэтацыі літаратурнага твора ў кантэксце эстэтычных прынцыпаў аналізу тэксту і метадычнай сістэмы перспектыўных ліній.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова